А. У. Жардзецкая (г.Мінск, Беларусь)

# АГУЛЬНАЧАЛАВЕЧЫЯ МАТЫВЫ Ў ТВОРЧАСЦІ А. ПУШКІНА І У. КАРАТКЕВІЧА

Творчасць А. С.Пушкіна, як і само яго жыццё, мае агульначалавечы характар. У яго асобе ўпершыню з’явіўся той рускі паэт, які стаў галоўнай духоўнай сілай краіны. Вакол яго стваралася тая эмацыянальная атмасфера адраджэння грамадскіх і нацыянальных сіл, якая дазваляла рускаму чалавеку адчуваць сябе прадстаўніком усяго чалавецтва.

А. С. Пушкін вечны, таму што перш за ўсё ён надсацыяльны, агульначалавечы. Сацыяльны пачатак у яго творчасці застаецца на другім плане, на першым – маральна-этычны. Пазіцыя А. С. Пушкіна – пазіцыя абаронцы агульначалавечых каштоўнасцей. Глыбокім раскрыццём праблем дабра і зла, міласэрнасці, жыцця і смерці, кахання і нянавісці, свабоды асобы, гармоніі прыроднага свету яго творчасць ва ўсе часы будзе прыцягваць чытача.

У знакамітым вершы «Элегія» былі ўпэўнена заяўлены праграмныя для творчасці паэта дэкларацыі: прага жыцця, гармоніі, сцвярджэнне гуманістычных ідэалаў. Пушкінскі мастацкі ідэал адлюстроўвае найвышэйшую смеласць у мастацтве – свабоднае незалежнае тварэнне. «Праўда як адзінства ісціны, дабра і прыгажосці не толькі ў варожасці, у бунце, барацьбе з асяроддзем, якую прыносіць у яе род чалавечы, але і ў вечным імкненні да гармоніі з самім сабой і светам, да каштоўнасцяў, на якіх заснавана шчасце і веліч чалавека, ідэал як крытэрый высокамастацкасці, духоўна-эстэтычнае сузіранне вечнай прыгажосці свету» [1, с. 35]. Менавіта свабоднае і гарманічнае перарварэнне жыцця ўяўляецца Пушкіну найвышэйшай каштоўнасцю:

Я жить хочу, чтоб мыслить и страдать;
И ведаю, мне будут наслажденья
Меж горестей, забот и треволненья:
Порой опять гармонией упьюсь,
Над вымыслом слезами обольюсь… [3, с. 169]

Пафас усёй паэзіі А. С. Пушкіна – прыманне жыцця, «лелеющая душу гуманность» (В. Г. Бялінскі). Выпрабаванне на чалавечнасць становіцца галоўным і ў прозе пісьменніка, асабліва ў аповесці «Капітанская дачка». А. С. Пушкін разумеў немагчымасць прымірэння варожых бакоў у крывавай і знішчальнай грамадзянскай вайне («Не приведи Бог видеть русский бунт, бессмысленный и беспощадный!»), але ён бачыў выратаванне асобы ў пачуцці чалавечай справядлівасці. «Для Пушкина в «Капитанской дочке» правильный путь состоит не в том, чтобы из одного лагеря современности перейти в другой, а в том, чтобы подняться над « жестоким веком», сохранив в себе гуманность, человеческое достоинство и уважение к живой жизни других людей» [2, с.124].

Мастацтва А. С. Пушкіна дапамагала беларускім пісьменнікам паглыбляць сваю гуманістычную канцэпцыю ў адпаведнасці з рэвалюцыйнымі ідэаламі эпохі, развіваць і ўзнімаць на новую вышыню дзейсны пачатак гуманізму ў сваёй творчасці. Спадчына А. С. Пушкіна аказала выключнае ўздзеянне на нашых класікаў: Я.Купалу, Я. Коласа, М. Багдановіча, а таксама У. Караткевіча, якога

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

захаплялі найперш майстэрства А. С. Пушкіна, вольналюбівыя матывы яго паэзіі, гістарызм яго твораў і яго роздум над лёсам народным.

У.Караткевіч як і яго вялікі папярэднік у сваіх шматлікіх вершаваных, а таксама празаічных творах, такіх як «Сівая легенда», «Дзікае паляванне караля Стаха», «Нельга забыць», «Каласы пад сярпом тваім», «Хрыстос прызямліўся ў Гародні» і іншых засяроджвае ўвагу на праблемах прызначэння чалавека на Зямлі, гераізму і здрады, дабра і ліха, кахання і нянавісці, чалавечай годнасці і гонару, гуманізму, каштоўнасці жыцця.

Вялікі майстра слова быў заўсёды верны ідэалам дабра, справядлівасці, хараства. І героі яго кніг – увасабленне гэтых ідэалаў. Яны – рыцары духу, асветнікі, шукальнікі, барацьбіты. У. Караткевіч лічыў, што беларускі мужык не халоп па сваёй першароднай якасці, а змагар, з высокім пачуццём чалавечай годнасці. Па гэтай прычыне пісьменнік у рамане «Нельга забыць» стварыў новы тып героя-праўдашукальніка і гуманіста. Наўмысна спалучыўшы ў творы два часавыя вымярэнні, У.Караткевіч праводзіць думку аб тым, што ў кожным грамадстве заўсёды знаходзіліся людзі, якія выступалі супраць дэспатыі ўлады і выяўлялі свае лепшыя якасці – высакароднасць, сумленнасць, дабрыню, міласэрнасць, высокую годнасць і гонар.

Галоўны герой рамана – паэт Андрэй Грынкевіч, які з’яўляецца нашчадкам асуджанага на смерць кіраўніка атрада паўстанцаў Усяслава Грынкевіча, лірык па натуры і рамантык па светаўспрыманні. Ён пакутліва шукае адпаведнасці высокай маральнасці чалавека ў антымаральным сучасным грамадстве. Як некалі К. Каліноўскі і У. Грынкевіч, Андрэй уступае ў трагічнае процiборства з сістэмай і застаецца пераможаным, але толькі знешне, сацыяльна. Бо яго высокую духоўнасць перамагчы нельга.

Аўтар завастрае ў творы і праблему свабоды асобы. Як лічыць У. Караткевіч, чалавек свабодны па-сапраўднаму, калі ён здабывае свабоду іншым, тады яго жыццё можна назваць подзвігам. А калі ўвесь сэнс яго існавання абмяжоўваецца толькі барацьбой за ўласны дабрабыт, то такое жыццё можна лічыць пакутай. На думку пісьменніка, чалавек можа ўсё. Няма межаў яго сілы, калі наперадзе агонь надзеі.

Праз увесь раман У.Караткевіча лейтматывам праходзіць ідэя аб ролі мастацтва ў жыцці чалавека, яго пераўтваральнай сіле. На думку пісьменніка-гуманіста, адрадзіць чалавека, вярнуць яму веру ў сябе, у жыццё можа толькі свет мастацтва і высокае каханне. Андрэй Грынкевіч пасля гібелі каханай дзяўчыны Алены Століч згубіў веру ў жыццё, стаў унутрана мёртвым. Адраджэнне яго пачалося са знаёмства з Ірынай Горавай, з іх сумеснага далучэння да свету сапраўднага мастацтва, гэтага «дзіва чалавечага генія». І тады свет раптоўна зайграў перад ім усімі фарбамі вясёлкі.

Да спрадвечных ісцін чалавечага быцця У.Караткевіч адносіць і гарманічнаестаўленне да прыроднага асяроддзя, а таксама каханне. Свет мастацтва і прыроды, аднавіўшы душу Андрэя і выклікаўшы страчаную ім прагу да жыцця, угатавалі глебу і для сапраўднага кахання.

Такім чынам, выкарыстоўваючы творчыя набыткі А.С.Пушкіна, У.Караткевіч у рамане «Нельга забыць» стварыў сваю маральна ўдасканаленую канцэпцыю рэчаіснасці. Пісьменнік адзначае, што сучасны свет, адносіны ў ім выступаюць супраць маленькага чалавека, свет гэты антыгуманны. Маральнае ачышчэнне сучаснасці адбудзецца тады, калі не толькі асобны чалавек, але і

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

грамадства ў цэлым, яго свядомасць абудзяцца ад спячкі, уздымуцца, як гэта было ў час сівой даўніны, а таксама ў час паўстання 1863 года.

**Літаратура**

1. Гринкевич, В. В. Духовно-культурное «самостоянье человека» в творчестве Пушкина / В. В. Гринкевич // Адукацыя і выхаванне. – 2004. – № 5. – С.34–40.

2. Лотман, Ю. М. Идейная структура «Капитанской дочки» / Ю. М. Лотман // В школе поэтического слова. Пушкин. Лермонтов. Гоголь : кн. для учителя. – М. : Наука. – С. 116.–128.

3. Пушкин, А. С. Полн. собр. соч. : в 10 т. / А. С. Пушкин – Л. :Худож. лит.,1977. – Т.3. – 496 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ